# Нябачная Беларусь

## Акварэльныя вобразы Марыі Каралёвай вяртаюць страчаныя святыні

**Персанальны выставачны праект Марыі Каралёвай «Старая Беларусь: ззянне роднага краю» ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча дае наведвальнікам унікальную магчымасць перанесціся ў часе і сваімі вачыма ўбачыць страчаную архітэктурную спадчыну нашай краіны.**

Мастачка скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (спецыяльнасць «кампаратыўнае мастацтвазнаўства»). Падчас навучання Марыя захапілася гісторыяй і мастацкай спадчынай Беларусі, што і вызначыла яе творчы шлях. Некаторы час працавала навуковым супрацоўнікам у Музеі гісторыі горада Мінска, праводзіла аўтарскія экскурсіі па славутых мясцінах беларускай сталіцы.

Як сапраўдны аматар пленэраў творца шмат часу аддае адлюстраванню роднага горада, вынікам чаго стала серыя акварэляў «Менск. Горад сонца». У 2022 годзе выйшла аўтарская «Вандроўка-размалёўка. Антыстрэс па-беларуску», дзе пад каляровай вокладкай змешчаны сорак восем размалёвак адметных архітэктурных пабудоў Беларусі. У тым жа годзе выйшаў каляндар «Страчаны Менск», дзе мастачка адлюстравала архітэктурную спадчыну, якая да нашых дзён не захавалася. Гэтую ж тэму працягвае праект «Мая нябачная Беларусь» — штогод выходзіць каляндар з аднайменнай назвай і дванаццаццю ілюстрацыямі страчаных будынкаў Беларусі.

Выставачны праект у Літаратурным музеі Максіма Багдановіча з'яўляецца натуральным працягам шматгадовай даследчай і творчай працы мастачкі. Марыя Каралёва не ставіць перад сабой задачу зрабіць дакладную гістарычную рэканструкцыю. Мэта праекта — праз лёгкія празрыстыя акварэльныя замалёўкі стварыць у гледача асаблівы настрой, які дапаможа паглыбіцца ў гістарычны кантэкст краіны і атрымаць незабыўныя эмоцыі.



«Цімкавічы. Касцёл Св. Арханёла Міхаіла», 2025 г.

Экспазіцыя падзелена на дзве часткі. Акварэльныя замалёўкі гістарычных будынкаў знаёмяць наведвальнікаў са страчанай, але не забытай архітэктурнай спадчынай. Тут можна ўбачыць такія славутыя мясціны, як Дом Гаўсмана (Мінск), Касцёл Святога Фамы Аквінскага (Мінск), Палац Касакоўскіх (Вялікая Бераставіца), Сядзіба Цітовых (Смаляны), Ільінская Царква (Віцебск), Палац Радзівілаў (Манькавічы), Палац Сапегаў (Дзярэчын), Палац Абуховічаў (Сваятычы) і інш.

Нельга не адзначыць аўтарскае захапленне паперай, якое з'явілася яшчэ ў мастацкім каледжы і ўвасобілася ў асобны праект «Свяцільні» — невялікія драўляныя скрыначкі, дзе за шклом — некалькі слаёў паперы. Выразаныя згодна з сюжэтам, яны ствараюць агульную шматслойную кампазіцыю, якая падсвечваецца. Для другой часткі выстаўкі «Старая Беларусь: ззянне роднага краю» падрыхтаваны свяцільні, якія ўяўляюць сабой месцы, звязаныя з жыццём і творчасцю Максіма Багдановіча. Сярод іх — знакамітыя касцёл Святой Ганны ў Вільні, Вострая брама, вулачкі і адметныя храмы Гродна і Мінска. Спецыяльна для праекта выразана вялікая панарама Верхняга горада, дзе, верагодна, не раз бываў паэт.



Свяцільня «Мінск. Царква святых апосталаў Пятра і Паўла», 2025 г.

Выстаўка працуе да 16 сакавіка.

*Лізавета* **КРУПЯНЬКОВА**